№ 17. Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Завальная 7.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі—25 фэніг.; дробныя абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці—60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 17 (109). Год II. Вільня, 27 лютаго 1917 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.).

Маскоуская шляхта жадае рэформ.

26 лютаго.

Заходні тэатр:

Між Армант'ер і Анкр адбіты ў некалькіх пунктах разведачныя наступленьня англічан.

У чысьленых бітвах на паветры ворагі ўчора утрацілі 8 самалётоў, у тым ліку два, дарэмна памыкаўшыеся скінуць бомбы ў ваколіцах ракі Сар.

Усходні тэатр:

Фронт Леопольда Баварскаго: На заходзі ад Аа адбіты дружыны расейскіх егроў. Каля дарогі Ковэль-Луцк узят у палон сэкрэт ворагоў. На поўдні ад Бэрэжан мейсцовая атака расейцоў не ўдалася.

Фронт эрц-герцога Іозэфа: На поўначы ад Татарскаго праходу адбіт расейскі штурм, ведзены вялікімі сіламі.

Фронты *Макензэна* і *Македонскі*: Без выдатных прыпадкоў.

Рэзолюція маскоускай шляхты.

БЭРН. Пецярбурскі карэспандэнт «Temps» даносіць, што шляхта маскоўскай губэрні падала цару сваю рэзалюцыю, у якой гаворыцца аб небясьпечнасьці неспаўненьня волі Думы і Рады аб рэформах у Расеі. Унутранае палажэньне Расеі перажывае вельмі востры момэнт. Атклад развязкі крызіса можа адбіцца на ходзі вайны. Дабрабыт старонкі і трону залежыць ад правядзеньня ў жыцьцё прынцыпоў, апавешчаных праваднаўчымі установамі і земствамі.

Новые арэшты работнікоу.

КОПЭНГАГА. Расейскія газэты даносяць аб арэшце прэдстаўнікоў работнікоў у ваенна-прамысловым камітэціі і ў Самарскай губэрні. Маршалак камітэту быў на аўдыенцыі у Голіцына, каторы яму сказаў, што ён ня можа нічога зрабіць дзеля арыштаваных работніцкіх дэлегатоў.

Пецярбурская конфэрэнція.

КОПЭНГАГА. Паводлуг тэлеграм с Пецярбурга, мэта конфэрэнціі саюзьнікоў — гэта еднасьць опэрацій усіх саюзьніцкіх армій. Асаблівую увагу звертаюць і на пытаньне аб выраблянні амуніціі, аб гандлю і прамысловасьці у саюзьніцкіх старонках.

Учасьнікі конфэрэнціі паедуць у Маскву, Кіеў і іншыя гарады Расеі дзеля бліжэйшаго знаёмства з гэтымі пытаньнямі.

Экономічны крызіс у Расеі.

КОПЭНГАГА. Маскоўская газэта „Утро Россіи“ друкуе рэзультаты інспэкцыйнай падарожы міністра сельскай гаспадаркі дзеля выясьненьня спосабу здаволеньня народу спажыўнымі прадуктамі ў розных мейсцох імперыі. Галоўную перашкоду ў развязцы гэтай справы становіць недастача організаціі перавозкі прадуктоў. У некаторых пунктах Тамбоўскай губэрні ляжыць 9 мільёноў пудоў жыта, а ў Самарскай—ажно 18 мільёноў, якіх нельга вывязьці с прычыны недахваткі вагоноў. У найбліжэйшых месяцах нельга зусім спадзявацца палепшэньня гэтых варункоў. У той час, як у адных мейсцох сабіраюцца вялікія запасы прадуктоў, у другіх, асабліва ж у вялікшых гарадох, народ церпіць ад недахваткі іх.

Адгалоскі блокады.

ВЕНА. Львоўскія газэты пішуць, што с прычыны падводнай вайны пасажырскія, таварныя і пачтовыя зносіны між Расеей і яе саюзьнікамі зусім спыніліся. З гэтай прычыны расейская тарговля мае аграмадныя страты.

Пагібель францускаго дырыжабля.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). У начы з 23 на 24 лютаго нашым зэнітным агнём падгален францускі лятучы карабель. Абняты полымем, ён зваліўся на зямлю на заходзі ад Зваргвмюнд і ўзарваўся. Усе 14 душ каманды забіты.

Вільня, 26 лютаго.

Цар Фэрдынанд Боўгарскі сьвяткуе сяголеньня свой 56 дзень урадзін. Сіла Боўгарыі—гэта яго заслуга.

Радзіўся ён у Вені 26 лютаго 1861 году. Пасьля таго, як князь Александар Батэнбэргскі быў скінут с трону, боўгары выбралі князем Фэрдынанда. Але іншыя дзяржавы, ў тым ліку і перш за другіх Расея, доўга не прызнавалі яго за галаву Боўгарыі, і расейскія газэты доўга называлі яго толькі Фэрдынандам Кобургскім.

Найцяжэйшы дзень у яго жыцьці—гэта, бадай, дзень падпісаньня ў Букарэшці мірнай умовы, паводлуг каторай Боўгарыя прымушэна была уступіць Сэрбіі вялікшую часьць сваей здабычы с першай турэцкай вайны. Сягоньняшні дзень урадзін бачыць заклятых ворагоў Боўгарыі — сэрбоў і румыноў—разбітымі войскамі цэнтральных дзяржаў, да каторых прылучылася і Боўгарыя дзякуючы мудрай палітыцэ свайго цара.

„Гістарычная міссія“.

Польскія газэты далей дапаўняюць заяву польскаго каронннаго маршалка аб гістарычнай «міссіі» Польшчы, якая маніцца паняволіць суседнія землі, адваёваныя нямецкім аружжэм ад Расеі. Так, спадзяючыся адступленьня расейцоў на лінію Прута, львоўская «Gazeta Wieczorna» ў сваім часі пісала: «ад удачы гэтаго наступленьня.. проці лініі Прута і мабыць за гэту лінію будуць, пэўне, залежаць будучыя граніцы польскай дзержавы на ўсходзі». А «Nowa Reforma» ў нумэры з 15 студня кажэ, што граніцы польскай дзержавы павінны абнімаць «Літву, а найменш—Беларусь».

Вельмі дзіўна тое, што гэтай справай занімаюцца польскія газэты не ў Каралеўстві Польскім, а ў Аўстрыі—ў Галічыне. Мы бы ім парадзілі лепш занімацца справамі іх бацькаўшчыны—Галічыны, бо аб крыўдах якія палякі тамака чыняць украінцам, гаворыць ужо ўвесь сьвет.. А ўсё ж галасы памененых газэт дужа цікавы: яны паказваюць, што гвалт над слабейшымі націямі стаўся ідэалам польскаго грамадзянства як у «вольнай Польшчы», так і ў іншых краёх, дзе толькі жывуць палякі, што гэты новы ідэал выціснуў і заняў мейсцо колішняго сьветлаго клічу паняволенаго польскаго народу «за нашу і вашу волю!»

Польскія «палітыкі», развіваючы сваю думку аб бязкроўным «заваеваньні» Беларусі і Літвы, стараюцца свой «апэтыт» на Беларускую зямлю апраўдаць тым, што ў нас бытцым то пераважывае польскае насяленьне. З гэтай прычыны яны аб'яўляюць за палякоў усіх беларусоў каталікоў. У гэтай рабоці «наварачываньня» «палітыкам» гэтым пільна служаць польскія ксяндзы ў нашым Краю, выклікаючы горачы пратэст усіх, у каго ёсьць у душы хоць трохі сумленьня. І хоць беларусы ўсёж такі не перэстаюць быць беларусамі, хоць да палякоў перахадзяць найгоршые элементы ў нашым народзі, — палякі не сумлеваюцца аб сваім праве называць палякам кожнаго, хто ў нашым Краю моліцца ў каталіцкім касьцелі. Ды гэта яны заяўляюць публічна—без ніякаго сораму.

Як пішэ украінская часопісь «Вільне Слово» ў № 7 з 24 студня, „польскі «географ» Ромэр нідаўна чытаў лекцыю аб чысьле палякоў і дайшоў да пераконаньня, што на ўсенькім сьвеці іх ёсьць 28 мільёноў. У тым ліку роўна 10 мільёноў у Каралеўстві Польскім, 5½ мільёноў у „Літве і Русі“ (Русь—гэта Беларусь і Украйна) і 4 мільёны ў Нямеччыне. Тым часам у «Літве і Русі» паводлуг урадовай статыстыкі палякоў лічылося не 5 400.000 (на 1910 год), а ўсяго толькі 1 мільён!“ Такой нячутай і такой сьведома фальшывай цыфры «польскаго насяленьня» ў «Літве і Русі» дагэтуль ніхто ня меў сьмеласьці падаць, і яна магла утварыцца толькі такім спосабам, як мы вышэй сказалі: «абярнуўшы» ў палякоў усё беларускае і украінскае каталіцкае насяленьне...

Кажуць, што каго Бог хоча пакараць, таму перш аднімае розум. Гэта акурат можна цяпер аднясьці да палякоў. Рэлігійны і нацыональны уціск у колішняй незалежнай Польшчы быў адной з галоўных прычын пагібелі гэтай дзержавы: ён даў право суседнім дзержавам, баронючы сваіх аднаверцоў, умешацца ў унутраные справы палякоў, а гэта, як вядома, скончылося раздзелам гасударства. Ня гледзячы на гэткую яркую навуку гісторыі, палякі — напераддодні адбудовы сваей дзержавы—хочуць гвалтам далучыць да яе чужые землі, засудзіўшы перш чарод на сьмерць беларусоў. І калі-б іх жаданьне хоць у малой меры збылося, калі-б хоць частка нашаго народу папала ў польскую няволю, — дык на целі новай Польшчы створыцца незажываючая рана, якая можа паслужыць прычынай паўтарэньня старой гісторыі: беларусы не дадуць сябе з'есьці без барацьбы, яны падымуць свой голас проці насільнікоў на ўвесь сьвет, і пры-

хільныя нам народы працягнуць нам руку помачы, кладучы канец нашым мукам.

І. Мялешка.

З дакумэнтоў мінуушчыны.

У 3-ім сшытку «Маладой Беларусі» за 1913 год надрукована ніжэйпісаная цікавая заметка:

„Паважаны пан прафэссар Эд. А. Вольтэр у ласкавым лісьце сваім да нас, шчыра вітаючы «Маладую Беларусь», звертаець нашу увагу на тое, што у 1501-м гаду «die Mercurii ultima mensis Martis» у апошнюю сераду месяца сакавіка (Марца) Эразм Вітэллій гаварыў у Рыме папежу Александру Шостаму «(Літвіны) Linguam propriam observant. Verum, quia Rutheni medium fere ducatum incolunt, illorum loquela, dum gracilis et facilior sit, utuntur communius» (Theiner T. II pag. 278). Гэта значыць: (Літвіны) маюць сваю ўласную мову; але дзеля таго, што русіны (беларусы) жывуць амаль не ў сярэдзіне (іх) княжства, яны (літвіны) часьцей ужываюць іхнай (беларускай) гутаркі, бо яна прыгожая і болі лёгкая».

„Ахвотна і с падзякай друкуем мы тут гэту вельмі цікавую і важную для нас гісторычную, спрад 412-ці гадоў, вестку аб нашай мове.

Рэдакцыя „М. Б."

Да гэтай заметкі Рэдакцыя «М. Б.» дае гэткіе паясьненьня:

Erasmus Vitellius — Эразм Вітэллій — гэта лацінскае названьне, на польску ён звауся Erazm Ciołek (па нашаму Цялюк). Родам паляк, здаецца, с Кракова, чалавек вельмі вучоны, быў ён у тым часе катэдральным віленскім пробашчэм, протонотарыушым папежскім і сэкрэтаром вялікаго князя літоўскаго Александра, каторы пасылаў яго ў Рым выразіць папежу Александру VI-му Борджія сваю пакорнасць. Гаварыў ён гэта у сваей мове к папежу. У 1503 г. ён стаўся Плоцкім біскупам і памёр у 1522 г.

Rutheni — русіны, так называлі тагды беларусоў, расейцоў жэ, велікаросаў, звалі Moscoviti — маскалі.

Мова Вітэллія выдрукавана ў агромнай кнізе: «Vetera monumenta Poloniae et Lithuaniae gentiumque finitimarum historiam illustrantia maximam partem nondum edita ex tabulariis Vaticanis depromota, collecta ac serie chronologica disposita ab Augusto Theiner presbytero Congregationis Oratorii, Consultore ss. Congregationum Indicis librorum prohibitorum, Episcoporum et Regularium ac Sancti Offici, Socio Collegii Theologorum Archigymnasii Romani, Academiae Pontificiae Archaeologiae et Academiae Herculanensis, Institutorum Belgici et Hungarici, Tabulatorium Vaticanorum praefecto etc. etc.» Tom II. Ab Joanne PP. XXIII usque ad Pium PP. V 1410—1572. Romae 1861. № 299. стр. 278, верш. чацьвёрты зверху.

Лёгкая рада.

(*пісьмо у Рэдакцыю*).

Я прачытаў у «Гомане», што духоўные ўласьці Віленскай дыэцэзіі кажуць, бытцым тут зусім німа ксяндзоў, якіе зналі-бы беларускую мову. Я не магу устрымацца, каб ня высказаць свайго шчыраго здзіўленьня. Запраўды: як могуць ісьці да народу нашаго ксяндзы, которые не знаюць мовы яго? Як могуць спаведаць тых простых вясковых людзей, которые іначай, як па-беларуску, ня умеюць гаварыць? Як могуць ім тлумачыць, што добра і што грэх? Як могуць абвешчаць ім Слово Божае?

Як каталік, як сын Беларускаго народу, я не магу зразумець, чаму-ж духоўная ўласць не падумала аб тым, каб каталіцкі ксёндз, едучы ў беларускую вёску, навучыўся-бы перш мовы тых людзей, с которымі будзе мець дзело? Калі цяпер мы чуем заявы, што ксяндзы ў Беларусі пабеларуску ня ўмеюць, — дык хто-ж, калі не само духавенство павінно паруціцца, каб такой ненормальнасьці надалей не было? На гэта рада ёсць — і рада зусім лёгкая: **завясьці ў духоўнай сэмінарыі ў Вільні навуку беларускай мовы для ўсіх клерыкоў.**

Мінуў ужо год, як беларуская мова прызнана ў нас офіцыяльна роўнапраўнай з іншымі краёвымі мовамі. І калі-б духоўная адміністрацыя хацела, дык ужо даўно маглабы ўвясьці гэту няхітрую навіну ў Віленскую Сэмінарыю, а тады нашаму духавенству не прыходзілося бы прызнавацца, што аб верных сынох Касьцёла Каталіцкаго—беларусах яно так мала клапацілося....

Беларус-Каталік.

Ліда, 24 лютаго 1917 г.

Злітоўскаго жыцьця

Колькі слоў аб літоўскай літэратуры.

У журнале «Litauen», які выходзіць у Бэрліне, чытаем між іншым:

Народные песьні у літвіноў называюцца „дайнос". Імі ў свайм часі цікавіўся нават найвялікшы нямецкі паэт Гэтэ. Гэтые „дайнос" народ укладае ешчэ і цяпер. Душа літоўскаго народу — вельмі уважлівая і склонная да насьмешкі, аддаецца вельмі лёгка безмэжовай тузе; гэткай яна выяўляецца і ў тых песьнях. На жаль, у „дайнос'ах" не спатыкаюцца ўспаміны аб вялікіх князях літоўскіх, і гэтак гісторычнай народнай паэзіі у літвіноў німа. Калі Вялікае Княства Літоўскае даходзіло найвялікшай магутнасьці, паэтамі народнымі былі „буртінікай". Гэта —песьняры, гаварыўшые і пеяўшые свае песьні. Яны спатыкаліся ешчэ ў XIV сталецьці, але с прычыны ваяўнічаго адношэньня да іх касьцёла за паганскіе успаміны яны выявяліся зусім. Гэтак літоўскі народ — гэта ядыны народ у Эўропе, каторы не апевае сваей славы і сваіх пабед. Затое ў „раўдас" літвіны аплаківаюць сваіх нябожчыкоў.

У часі рэформацыі побоч з народнай паэзіей нарадзілося і пісьменство. У 1547 гаду вышоў у літоўскім перэкладзі катэхізм. Да XVIII ст. літэратурная работа абмежываецца перэкладамі біблій, касьцельных і літургічных кніг і т. п. У XVIII ст. Дуонэлайціс напісаў свае „Метас", якіе даюць эпічнае апісаньне жыцьця і звычаёў літоўскаго народу ў чатыры поры году. Гэта — найбольш выдатны с-паміж старых твораў у літоўскай мові. У пачатку XIX ст. пачынаецца новы пэрыод літоўскай літэратуры. Тут выступаюць Костка, Даўкантас і Валянчюс. Асабліва ажывілася літоўская літэратура за апошніе 50 гадоў. Назавём некольки імён: лірык Майроніс, Шкупасака; Баронас, біскуп Сэйнэнскі, вершы каторага шырока вядомы між народам; В. Кудірка, перэтлумачыўшый Шыльлера і Байрона і напісаўшый рад цікавых аповесьцей і раманоў, у тым ліку вядомы „Звон літоўскіх званоў", ахвярованы новаму расьцьвету Літвы; Кудірка напісаў і літоўскі нацыянальны гымн „Літва наша Бацькаўшчына". У апошнім часі у літвіноў з'явілася і драматычная творчасць. Тут найбольш выдатны Гужутіс і Відунас. Трылёгія апошняго «Цені прэдкоў» лічыцца мастацкім творам. С-паміж літоўскіх пісьменніц назавём Жэмайте Шатрыёс-Рагана і Лаздыну Пэледа Віте-Вэкевіч.

У Вільні і ваколіцах.

× **Духоўная цэнзура беларускіх кніжэк.** Як мы даведаліся с пэўнай крыніцы, с прычыны непрыхільнасьці вышэйшай духоўнай уласьці у Віленскай дыэцэзіі да беларусоў усе рэлігійные кніжкі ў беларускай мове будуць паступаць дзеля цэнзуры і апробаты да Ковенскаго біскупа, каторы на гэта ўжо згодзіўся.

Друкі ў беларускай мове, якіе дагэтуль былі падаваны да цэнзуры адміністратару ў Віленскай дыэцэзіі, зусім не цэнзураваліся: польская касьцельная адміністрацыя ў нашай дыэцэзіі ўсемі сіламі працівілася таму, каб беларус меў набожные кніжкі ў роднай мове. Цяпер, трэба думаць, духовые патрэбы беларусоў-каталікоў будуць хоць часьцю вдаволены друкаваным словам.

× **Беларускі Клюб** гэтымі днямі перэбіраецца ў новую гасподу пры Віленскай вуліцы д. № 28. Новая гаспода—шмат абшырнейша, мае вялікую салю і сцэну, на якой можна ставіць невялікіе п'есы. Трэба спадзевацца, што выгоднае, хораша прыбранае памешчаньне прыцягне у Беларускі Клюб вялікшае число гасьцей, каторые будуць мець магчымасць праводзіць тут прыемна вольные вечары.

У Клюбе будуць віленскіе, краёвые і заграничные газэты і часопісі.

× **Грамадзянскі уголдлівы суд.** У сераду суд разглядаў рад спраў між кватэрантамі і упраўляючымі дамамі, гаспадары каторых павыежджалі з Вільні.

Дагэтуль упраўляючые на вызаў іх у уголдлівы суд атказвалі, што яны не могуць ставіцца, не маючы пазваленьня нямецкай уласьці. З гэтай прычыны урад саюза кватэрантоў учыніў патрэбные крокі перад прыналежнай уласьцю, і упраўляючым дамамі было выясьнено, што яны павінны ставіцца на суд с тым, каб прыгавор суда падавалі-бы ў мястовае упраўленьне.

× **Сьмерць выдатнаго гэбраіста.** Памёр адзін з найлепшых знаўцоў гэбрайскай мовы і біблії, Мордхай Якоб Габэр.

× **У саюзі дамаўласьнікоў.** Урад саюза на 1917 год складаецца з ніжэйпісаных асоб: маршалак — Казімір Шафнагель, намесьнік яго — д-р Эмануэль Кан, скарбнік — дэнтыст Самуіл Кац, сэкрэтар — Вінцэнты Сьвятопэлк-Мірскі, члены ураду: д-р Яцунскі, адв. Віктар Лукашэвіч, Владыслаў Невяроўскі, д-р Віршубскі і Абрам Чэрток. Кандыдаты: д-р Залкінд, Пескін і Вацлаў Рытэль.

Рэвізійная камісія: Ян Малаховец, Эдм. Ковальскі, Адам Зоялнскі; кандыдаты: Абрам Альпэровіч, Рубін Гілельс, Болеслав Рэксць.

Сэкрэтар ураду—Ян Камінскі.

× **Недаразуменьне.** У № 42 «Dzien. Wil.» з дня 22 лютаго надрукована:

„Нямецкіе ўласьці прызнаюць толькі тые заверэньня ў дабрачынных справах, каторые выданы Цэнтраляй Местоваго Кураторыум над беднымі".

Заметка гэта вызывае ў нас сур'ёзнае падазрэньне, што тут здарылося недаразуменьне. Мы думаем, што гэта хіба можэ адназіцца толькі да польскіх дабрачынных установ, бо трудна даць веры, каб чыста польскае Кураторыум магло-бы выдаваць заверэньня аб людзях, якімі апекуюцца камітэты іншых націй: беларускі, літоўскі, жыдоўскі. Трудна затым, што польскае Кураторыум ня можэ знаць варункоў жыцьця беларускай, літоўскай і жыдоўскай беднаты, не разумеючы нават мовы сваіх кліентоў.

Будзем спадзевацца, што справа гэта будзе у скорым часе выяснена.

× **Падатак на соль.** Апублікованы загад Глаўнакамандуючаго на Усходзі аб падатку на кухонную соль мае сілу ад 10 лютаго. Падатку наложэно 8 марак на двайны цэнтнэр (6 пудоў).

З варшаўскаго генэрал-губэрнатарства можна прывазіць соль толькі чыгункай. За падвоз солі з варшаўскаго генэрал-губэрнатарства контрабандай будуць сурова караць.

× **Падатак на дрэво.** Паводлуг загаду Глаўнакамандуючаго на Усходзі пры прадажы лесу трэба плаціць падатку 10 працэнтоў ад прадажнай цаны. Калі за год, пачынаючы ад кастрычніка 1916 г., адзін валадзелец прадаваў лес толькі адзін раз і ня болей, як на 6.000 м., дык з яго падатку не бяруць.

Глаўнакамандуючый на Усходзі можэ рабіць і іншые выключэньня.

Загад гэты мае сілу ад 1 кастрычніка 1916 году.

× **Новые правілы аб дзержаньні аружжа.** Глаўнакамандуючый на Усходзі выдаў новые правілы аб аружжы, патронах і узрыўчатых матэр'ялах, якіе маюць сілу ад 1 марца 1917 г. Яны загадываюць:

Дзержаць стрэльбы, патроны і узрыўчатые матэр'ялы забаронено ўсім, апрыч асоб, каторые маюць пазваленьне на пісьме. За дзержаньне аружжа, у тым ліку мысьліўскіх стрэльб, карацімуць сьмерцю або папраўчым вастрогам ня менш 3 гадоў.

Кожын, хто ведае, дзе ёсць аружжэ, павінен данясьці аб гэтым нямецкай уласьці; іначэй яго жджэ кара вастрогам да 6 месяцоў, або штрафам грашмі да 1.000 м.

× **Прыём тэлеграм.** Тэлеграмы цывільных асоб прынімаюцца толькі ў Нямеччыну, Варшаўскае генэрал-губэрнатарство і ў земліі Обэр Ост, апрыч опэрацыйнай тэрыторыі. Іх прынімаюць у будынку Stadthauptmanna, Домініканская 3, пакой 54а, ад 11 да 12 г. і ад 5 да 7 г.

× **На чыгунцы.** Ад гэтаго панядзелку пасажырскіе поезды 361 і 362 ў Коўну і назад болей кожын дзень ня ходзяць. Поезд 361 ходзіць толькі ў нядзелі; поезд 362 — толькі ў аўторкі.

× **Просьба аб весткі.** Ваенна-палонны Франц Шалкоўскі, родам з м. Кернова, пражываўшый перад вайной у Вільні пры Ноўгародскай вуліцы, просіць паведаміць яго сваякоў праз «Гоман», што ён знаходзіцца ў таборы для ваенна-палонных у Вормсе (Gefangenenlager Worms) і просіць аб весткі.

× **Скорая помач.** За апошні тыдзень ад 12 да 18 лютаго скорая помач дадзена ў 81 прыпадку. Карэтка скорай помачы выежджала 54 разы.

× **Драма ў польскай школі.** Вучня польскай гімназіі, Яна Снацкаго, судзіў акружны суд, вінавацючы ў тым, што ён памыкаўся забіць Марыю Каліноўскую, 18 гадоў, у кватэры яе бацькоў

дзеля гэтаго зрабіў ей многа ран, ад якіх яна магла памерці. Хаця Ян Снацкі — вучэнь 8-ай клясы, ён ня мог нават акуратна сказаць, сколькі яму гадоў. Ен заявіў, што яму 16 гадоў, як упісано ў яго пашпарці. Аднак, выданая з Астрабрамскаго касьцёла матрыка пахазвае, што яму ўжо 20 гадоў. Матка яго ня ведае, сколькі гадоў сыну і сколькі гадоў яна замужам. Абвіняемый як на сьледстві, так і на судзе казаў, што ён не вінават. Марыя Каліноўская, наадварот, і на сьледстві і на судзе цьвёрда паказвала на Яна Снацкаго, што ён яе параніў. Вучыцелі гавораць аб абвіняемым дужа добра.

Пракурор жадаў для яго 3 гадоў папраўчаго вастрогу. Аднак, акружны суд прызнаў, што віна не даведзена, і апраўдаў Снацкаго, прынімаючы кошты справы на казну.

× **Курс рубля:** офіцыальны — 2 м. 00 фэн. за рубель; у банках пры прадажы — 2 м. 26 ф., пры куплі—2 м. 30 ф.

Пазычковая каса бярэ 6%.

× **Нешчасьлівые здарэньня.** На Паплаўскай вул. № 21 упаў са ўсходоў і сламаў сабе нагу Рубін Арш. Яго адвязьлі ў жыдоўскі шпіталь.

На Домінікенскай вул. упаў зламаўшы сабе нагу Іцко Коткін. Яго так сама павязьлі ў Жыдоўскі шпіталь.

На Стэфанскай вул. каля млына гр. Тышкевіча на Івана Створоўскаго перэвярнуўся воз с каменным вуглем, ламаючы яму левую нагу. Яго ў карэтцы скорай помачы адвязлі у шпіталь Савіч.

× **Ад чаду.** Апошніе вялікіе марозы і нерэгуяярнае напаліваньне у печы с прычыны даражыні апалу вельмі часта былі прычынай нешчасьлівых прыпадкоў. Вось адзін з іх, каторы кончыўся сьмерцю 2-х асоб: нейкіе Грунды (Райскі завул. № 8), напаліўшы у печы каменным вуглем, леглі спаць. Раніцай Казіміру Г., 56 г., і Марыю Г., 20 г., знайшлі памёршымі; Пэтрунэлю Г.. 53 г., і Ядвігу Г., 18 г, каторые ешчэ былі жывы, адвязлі у шпіталь.

22 лютаго вачадзеў нейкі Гедройць с жонкай (вул. Згода 15). Іх адратавалі.

× **Ад газу.** У майстра гадзіннікоў, Шымела Ліпніцкаго (на вуглу Троцкай і Завальнай) запсаваліся газовые трубы, с прычыны чаго ад разхадзіўшагося па кватэры газу атруціліся сам гаспадар са сваім чэляднікам, Абрамам Бляնкштэйнам. Іх адратавалі.

× **На вуліцы.** 22 лютаго каля гадз. 8 веч. на Полтаўскай вул. пад брамай д. № 61 знайшлі якуюсь кабету са слабымі азнакамі жыцьця. Паввалі карэтку скорай помачы, каторая адвезла кабету у шпіталь Савіч, гдзе яна хутка памёрла. Думаюць, што яна атруцілася дэнатуратам, таму што ад яе вельмі пахла гэтай атрутай. Фаміліі памёршай не удалося даведацца.

× **Спроба самогубства:** У шпіталі для простытутак (Субоч 3) Алексаьдра Рацзюн (19 гадоў) дзеля самагубства напілася сублімату. Скорая помач адвезла яе у шпіталь Савіч.

× **Кража каня с санямі.** 23 лютаго а 12 гадз. ў дзень у арэндатара Івана Яхімовіча з Дворчан № 6, Віленскаго павету, перад домам № 6 пры Ягеллёнскай вул укралі каня с санямі. Шкода ацэніваецца на 600 марак. Конь быў с пархамі.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
за дзень з 21 на 22	— 6,5°	—16,5°
„ з 22 на 23	— 8°	—22°
„ з 23 на 24	—12°	—33°
„ з 24 на 25	+ 2°	—16°

З усяго Краю.

Дар Папежа літвіном.

КОЎНА. Папеж паслаў ковенскаму біскупу 20 тысяч франкоў на помач літвіном.

Папеж пазволіў літоўскім біскупам звярнуцца да біскупоў усяго сьвету с прызывам на 20 мая ўсюды загадаць модлы і збор грошы дзеля помачи літоўскаму народу.

Глаўны суд.

БЕЛАСТОК. Глаўны суд у межах Обэр Ост па загаду Глаўнакамандуючаго на Ўсходзі будзе мець пастаяннае мейсцо бытнасьці ў Беластоку.

«Ворагі чыстасьці».

ГРОДНЯ. У міравы суд паступіло некольні сот спраў аб тутэйшых жыхароў, не явіўшыхся ў пункт дзеля ачысткі ад вошы. «Ворагі чыстасьці» пакараны штрафам ад 1 да 5 руб., хоць адны з іх тлумачылі, што яны былі хворые, другіе—што не знайшлі дарогі, трэйціе—што спазьніліся.

Ахвяра марозоў.

ПАДБРОДЗЕ. На дарозі з Рэшы ў Падбродзе 17 лютаго знайшлі замершую кабету. Яе пахаранілі на жыдоўскім магільніку ў Мэйшаголі. Ніякіх дакумэнтоў пры ей не было.

За зарэзанае цяля.

КАПЛІЦА Селянін Модзюн засуджэн на 100 м. штрафу за тое, што зарэзаў цяля без пазваленьня.

Выстаўка тавароў.

КОЎНА. Урад нямецкіх тарговых палат (Amtliche Handelsstelle Deutscher Handelskammern) наладзіў у Коўні склад і выстаўку прымернікоў тавароў, с каторых Глаўнакамандуючый на Ўсходзі пры прывозі іх у межы Обэр Ост не бярэ падатку.

Падобные выстаўкі ладзяцца ў Вільні, Лібаве і Беластоку.

«Трайня».

КОЎНА. У пражываючай на Зялёных гарах кабеты радзілося трое дзяцей зразу. Бацька ўраз-жэ прыбег у местовы урад прасіць, каб яму выдалі тры новые карты на хлеб.

Цікавая справа.

СУВАЛКІ. Некій А. купіў у гандляра Б. каня ў стайні. Пасьля яны пайшлі разам у хату Б., дзе А. заплаціў яму 1350 м. Калі яны вярнуліся ізноў у стайню, каня тамака ўжо не было. Да іх прышоў нейкі Ц. і сказаў, што украдзенаго каня можна знайсьці, што ён бярэ рызыку на сябе і купляе каня ў А. за 1000 м. А. ўзяў ад Ц. 1.000 м., але пасьля аб усей справе паведаміў паліцію, каторая і пачала сачыць за Ц. Пад той час Ц., каторы таго каня проста завёў да сябе, паехаў у Аўгустово. Паведомленая цераз тэлефон аўгустоўская паліція задзержала яго разам с канём.

Справа цяпер такая: А. будзе атказываць перад судом за тое, што купляў каня без пазваленьня Krejshauptmanna; Б.—за тое, што прадаваў яго так сама без пазваленьня, і за спробу машэнства; а Ц.—за спробу машэнства і за кражу. Каня сконфіскавалі ўласьці.

За згвалтаваньне.

БУДВЕЦЕ, Мар'ямпольск. пав. Сувальскі акружны суд засудзіў аднаго тутэйшаго селяніна за згвалтаваньне пакаёўкі на 2 гады ў папраўчую турму. Прыгавор быў цяжэйшы затым, што зрабіў гэта чэлавек стары, ў катораго 6 дзяцей.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

Адстаўка Покроўскаго.

ШТОКГОЛЬМ. «Утро Россіі» пішэ аб заяве ў Думе міністра загранічных спраў, Покровскаго, што ён маніцца выйсьці у адстаўку.

Новые арэшты.

ШТОКГОЛЬМ. «Русск. Сл.» пішэ, што ў Маскве ждуць новых чысьленых арэштоў. Гучков і Коновалов знаходзяцца пад пастаянным надзорам.

12 лютаго адбыўся па ўсей Расеі спіс запасоў гэрбаты. Устаноўлено, што запасу гэрбаты хопіць найбольш на 14 дзён.

С прычыны недастачы вугальля, спыніўся электрычны трамвайны рух у ўсіх вялікіх местох, у тым ліку і ў Маскве. Трамвай ходзіць ешчэ толькі ў Пецярбурзі.

«Рай для чыноўнікоў».

Пецярбурская газэта «Рэч» пішэ: „Надрукаваную намі вестку аб тым, што ў лютым месяцу 1916 г. быў назначэн сувальскі губэрнатар, катораму далі грошы на выезд на мейсцо службы, а ў месяцу маі ён быў перанесен у Курск і ізноў атрымаў грошы на пераезд, — зацьмеваюць новые весткі.

„У лістападзі 1915 г. на губэрнатара ў Вільню быў назначэн Баггавут, а у сьнежню яго перэнясьлі у глыб старонкі. Абодва разы ён атрымаў вялікіе сумы грошы на пэнсію і пераезд. На яго мейсцо ў Вільню назначэн гр. Толстой, каторы і цяпер «занімае» гэтае мейсцо. У марцы 1916 г. назначэн губэрнатар для Гродзенскай губэрні, а ў ліпні месяцу 1916 г. яму дадалі віцэ-губэрнатара. У маі 1916 г. Гэндрыкова назначылі на губэрнатара Курляндіі“.

«Рэч» дае доўгі спіс падобных назначэньнёў. У тым ліку у жніўні 1916 г. сэкрэтар варшаўскаго губэрнатара Макалінскій быў перэнесен у Сувалкі і атрымаў «прагоны» на падарожу...

Разрыў тэлеграфных зносін.

ШТОКГОЛЬМ. Ад 20 лютаго з Расеі не даходзяць ніякіе прыватные тэлеграмы, ў тым ліку і офіцыальные апавешчэньня.

На запытаньне швэдзкаго тэлеграфнаго агенцтва пецярбурскае агенцтво атказало, што на далейшы час уселякіе тэлеграфные зносіны з Расеей прыпынены.

Залежаўшаяся почта.

ШТОКГОЛЬМ. С прычыны блокады Англіі, ўся почта з Расеі, якая ішла цераз Швэцію, астаецца ў Готэбургу, дзе сабралося 1200 вялікіх пачтовых мяхоў.

АБ ПОЛЬШЧЫ.

ПЕЦЯРБУРГ. 21 лютаго пад маршалкоўствам прэзыдэнта міністроў, Голіцына, адбылася нарада камітэту аб будучым устройстве Польшчы. На нарадзі былі: члены габінэту, маршалкі Дзержаўнай Рады і Думы, начальнік гэнэральнаго штабу, б. міністэр-прэзыдэнт Горэмыкін і Сазонов.

КОПЭНГАГА. Расейскай кадэцкай партіі с прычыны нязгодлівасьці у справе будучаго палажэньня Польшчы ў Расейскай дзержаве грозіць раскол. Значная меншасць членоў партіі стаіць за поўную незалежнасць Польшчы, а большасць стаіць на старым становішчы, жадаючы, каб палякам было дадзено толькі ўнутрэнае самаупраўленьне. Каб дайсьці згоды, пастаноўлено сазваць партыйны з'езд.

ВАРШАВА (В. Т. Б.). Варшаўскі магістрат нішчыць адну за аднэй усе памяткі расейскаго панаваньня. Гэтак рад вуліц, якім былі дадзены імёны расейскіх імператароў і гасударственых мужоў, атрымалі назад свае колішніе старые названьня, а новые вуліцы называюцца імёнамі, звязанымі з гісторыей Польшчы, асабліва з гісторыей змаганьня з Расеей. Так званы «памятнік ганьбы», пастаўлены Мікалаем I у памяць палякоў, якіе ў 1831 гаду прылучыліся да Расеі проці паўстаньня, будзе зніштожэн.

З усяго сьвету.

У стотысячную нядзелю.

Француская газэта „Фігаро“ вылічыла, што 8 ліпня гэтаго году будзе стотысячная нядзеля ад нарадзін Хрыста.

Да гэтаго француская бульварная газэта дадаець:

„Ня трэба быць вялікім оптымістам, каб спадзевацца, што гэтае вялікае сьвята будзе мець значэньне ў вайне і мо' прынясе даўно жаданы мір“.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

23.II. Заходні тэатр:

Пам даждком і ў тумане дзень блізка ўсюды прайшоў спакойна. На паадзінокіх пунктах фронту Артуа і Соммы, а так сама між Маасам і Мозэлем былі нячысьленые стычкі патрулёў. Увяты палонные.

Усходні тэатр.

Фронт Леопольда Баварскаго: Каля Смаргоні, на заходзі ад Луцка і між Залатой Ліпай і Нараёўкай агонь артылеры і мінамётоў крапчэў больш чым звычайна. Пры Звыжыне, на ўсходзі ад Злочова, нашы атрады ўварваліся на расейскіе пазыціі, ўзарвалі 4 мінные падкопы і вярнуліся назад, вядучы 250 палонных, 3 афіцэроў і 2 кулемёты. На палудзенным усходзі ад Бэрэжан гэтак сама ўдачна скончылася патрульная опэрація.

Фронт эрц-гэрцога Іозэфа: Нічога выдатнаго.

Фронт фэльдмаршалка Макензэна: У даліне Сэрэта, пры Корбулю,

нашы варты адбілі атаку некалькіх расейскіх рот.

Македонскі фронт: Нічога новага.

24.II. Заходні тэатр:

У завароці Вітчэта — вострая артылерыйская бітва. На фронці Артуа адбіты некалькі англіцкіх дружын разведчыкоў. У ваколіцах Соммы англічане занялі некалькі балоцістых пазыцій, пакінутых намі. У Шампані французы ў дзень і ў вечары памыкаліся адабраць назад здабытые намі 15 лютаго пазыціі на поўдні ад Ріпон. Іх атакі адбіты. На заходнім беразі Маасу, на паўночным усходзі ад Авокур, дружына ворагоў уварвалася на некаторые нашы пярэднія акопы. Контратакай пазыціі той час былі ад іх ачышчэны, і ў іх былі ўзяты палонные.

Усходні тэатр:

Пры сільным марозі асаблівых здарэньнёў не было.

Македонскі фронт: На ўсходзі ад Струмы мы абстрэлялі англіцкіе параходы на моры і англіцкіе пазыціі.

25. II. Заходні тэатр.

На палудні ад Іпра, між Армант'ер і Арра, адбіты некалькі прыгатаваных сільным агнём наступленьнёў англічан. На заходзі ад Лівін нашы дружыны разведчыкоў глыбока ўварваліся на пазыціі ворагоў, узялі палонных і шмат чаго зруйнавалі. У ваколіцах Соммы ад часу да часу вострая артылерыйская бітва, асабліва між Сайі і Бушавэнь. На ўсходзі ад С. Міель адбіта французская разведка. У лесі пры Мозэлі наш патруль узяў 12 палонных. Пры Люссэ, на заходнім склоне Вогез, нашы разведачные дружыны ўзялі ў палон 30 французоў.

У начы з 24 на 25 лютаго ў лесі на ўсходзі ад Заральбэн зваліўся загарэўшыся французскі лятучы карабель.

Усходні тэатр:

Фронт Леопольда Баварскаго: Без выдатных прыпадкоў.

Фронт эрц-гэрцога Іозэфа: У Татарскім праходзі, ў лясістых Карпатах, расейская атака не ўдалася.

На фронтах Макензэна і Македонскім—палажэньне, наагул, без перамен.

Аустрыяцкіе апавешчэньня.

ВЕНА 25.II. **Усходні тэатр:** (гл. нямецк. апав.).

Італьянскі тэатр: На прыморскім фронці—ізноў востры агонь артылеры. У ваколіцах Гэрцу, на адрэзку Вэртойбы, праз усю ноч і раніцай трываў вельмі востры артылерыйскі і мінамётны агонь, пад зашчытай катораго некалькі італьянскіх рот уварваліся на нашы пазыціі. Аднак, яны былі зусім выкінуты адтуль контратакай і мелі вялікіе страты.

Падводная вайна.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). За месяц студзень затоплены 170 караблёў агульнай ёмкасьцю 336.000 тонн. У тым ліку 91—англіцкі ёмкасьцю 245.500 тонн, 58—нэутральных ёмкасьцю 102.500 тонн.

Ад пачатку вайны затоплено караблёў ёмкасьцю 4 357.500 тонн; у тым ліку англіцкіх 3.314,500, нэутральных—459 караблёў на641.000 тонн

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). Адна з нашых падводных лодак 17 лютаго затапіла італьянскі транспорт «Міна», на каторым вязьлі тысячу душ салдатоў, вялікі запас снарадоў і на 3 мільёны марак золата ў Салонікі. Увесь груз, апрыч 2 людзей, выратаваных нашай падводнай лодкай, пагіб.

Новая «Марская Чайка».

КОПЭНГАГА. Новая «Марская Чайка», каторая, як кажуць, называецца «Puyme», затапіла ўжо надта вялікае числа параходаў. Яно даходзіць 26. За ей гоняцца 11 англіцкіх, некалькі французскіх і 1 японскі ваенны параход.

Мэта вайны.

БЭРЛІН. 22.II. Рэйхстаг. Маршалак Рэйхстагу аткрыў заседаньне прамовай, у якой, між іншым, сказаў:

„Мы пакінем нашэ аружжэ не раней, як дайшоўшы мэты вайны: дабіўшыся незалежнасьці і волі для нашай бацькаўшчыны".

300 мільярдоў на вайну.

БЭРЛІН. Рэйхстаг. Жаданы нямецкім урадам ваенны крэдыт 15 мільярдоў марак зацьверджэн Рэйхстагам большасьцю ўсіх галасоў проці галасоў партіі соцыалістычнай работніцкай еднасьці.

Як сказаў міністэр фінансоў, ваенные выдаткі ўсіх ваюючых старон перайшлі ўжо за 300 мільярдоў марак.

Разрыў між Амэрыкай і Нямеччынай.

НЬ'Ю-ІОРК. Рэспубліканская партія ў сэнаці пастанавіла не даць Вільсону неаграніченых паўнамочый. Наадварот, перад кожным сур'ёзным крокам Вільсон павінен атрымаць згоду Сэнату.

ВАШЫНГТОН. Прэзыдэнт Вільсон пастанавіў сазваць Сэнат на надзвычайную сэссію 6 марца.

Фіаско Вільсона.

ШТОКГОЛЬМ. Пэрскае правіцельство аткінуло прэдлажэньне Вільсона разарваць зносіны з Нямеччынай і заявіло, што Пэрсія да канца вайны будзе дзержацца самай суровай нэутральнасьці.

Гэткі-ж атказ даў Вільсону і Сіям, каторы аграничыўся толькі формальным пратэстам проці падводнай вайны.

БЛОКАДА АНГЛІІ.

ЛОНДОН. Марскі міністэр Карзон сказаў у Ніжняй Палаці, што за першые 18 дзён блокады затоплены 134 англіцкіе, саюзьніцкіе і нэутральные параходы

ЛОНДОН. Англіцкае правіцельство надрукавало ва ўсіх газэтах гэткую адозву:

„Караблі прывозяць нам бараніну і мяса валоў, а наш хлеб мы пячэм са збожжа, якое падвозіцца ў Англію гэтак сама на караблёх Бяз гэтых спажыўных прадуктоў англічане павінны памерці з голаду. Немцы будуюць падводные лодкі, каб тапіць нашы караблі, і думаюць, што гэтым спосабам выіграюць вайну. Народ бяз ежы ня можэ жыць і ня можэ ваеваць,—значыць, трэба будаваць больш караблёў і вытвараць больш спажыўных прадуктоў. Кожын мужчына ад 18 да 60 гадоў павінен сваей ахвотай станавіцца на нацыональную службу. Мы ня можэм траціць часу".

ЛОНДОН. Загад правіцельства устанавіў, што 1 марца ў рукі ураду пераходзяць усе капальні вугля, воды і каналы Англіі.

Атказ англічан на блокаду.

ЛОНДОН. У атказ на забарону Нямеччыны нэутральным параходам заезджаць у англіцкіе порты пад грозьбай затапленьня іх англіцкі урад выдаў прыказ, што ўсе нэутральные параходы павінны заезджаць у які-небудзь англіцкі порт, бо іначэй англічане будуць іх конфіскаваць.

Кабеты ў арміі.

ЛОНДОН. Гэнэрал Мак Рэді дамагаецца, каб у Англіі і Франціі было назначэно чым больш кабет у армію дзеля запаўненьня мейсц мужчын, пасланых у акопы. Ужо цяпер у арміі працуе 30.000 кабет, як аўтомобілісткі і т. п.

Спіс ваенна-палонных з нашаго краю.

З Вільні і Віленскай губэрні.

Табор для ваенна-палонных Skalmiershütz.

Соломяк Якуб, Дзіт.
Шыпуль Ефім, Слаўшыха.
Татерцэ Александар, Полелейкі.
Матушэвіч Мікалай, Кацеўнічы.
Слізь Юстын, Старынкі.
Яковлеў Нікіфор, Масьцішчэ.
Волковіч Язэп, Крымкі.
Масеёнак Антон, Казлы.
Шчасны Вінцэнты, Байбы.
Гайдамовіч Вінцэнты, Прэны.
Рамулевіч Хома, Толоцішкі.
Собіеўскі Антон, Купянішкі.
Кучка Іван, Шыры.
Ячуна Ян, Усуднікі.
Турскі Вінцэнты, Бобровічы.
Сосноўскі Ян, Трондзішкі.
Войнаровіч Іван, Саковічы.
Аўгустыновіч Іван, Селішчэ.
Давідчык Міхаіл, Мыто.
Стасюн Язэп, Будзіле.
Галінскі Іван, Рэмуні.
Косевіч Аполінары, Чэрэшкі.
Мішкін Марціян, Міхальчуны.
Тамаш Ілья, Слаўшчыніха.
Вімунтіс Александар, Дагіцкі.
Войцеховіч Пётр, Гольгоўшчына.
Валынец Александар, Парабіска.
Макевіч Станіслаў, Анчары.
Кудароўскі Рох, Рускае Сяло.
Дэм'янкіс Ксавэры, Бушочы.
Палевіч Іван, Пэдляй.
Страдос Болеслаў, Шэркойцы.
Качаноўскі Язэп, Вясёлаўка.
Яцына Казімір, Ворошылкі.
Петкун Адольф, Слабада.
Кудаш Сямён, Коновічы.
Міклашэвіч Сямён, Малы Берэзовец.
Пачкоўскі Антон, Стовнішкі.
Табор Франц, Шліпэльск.
Волковіч Віктор, Сосьлів (?).
Порцімовіч Міхаіл, Острына.
Кошукайло Владзімір, Малышы.

Табор для ваенна-палонных Danzig-Troyl.

Лагер I.

Кісілеўскі Казімір, Фольварк.
Кельмэн Эльe, Вішнев.
Гаўс Озэр, Ранашысік.
Эйнік Бэйніс, Вільня.

Табор для ваенна-палонных Sagan.

Юрковлян Антон, Вільня.
Рачка Іван, Рыбакі.
Альфэровіч Давід, Вільня.
Гольдбэрг Фэйвіш, „
Бебільскі Якуб, Ліда.
Рубіновіч Абрагам, „
Валоцкі Хаім, Вільня.
Луктульскі Мэнаш, „
Зэльтін Эрнэст, „

(Далей будзе).

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтво «Гоман». Редактар В. Ластоўскі.